Источник: "Рэспубліка" - 2017-02-08

ЗАЎТРА



На фестывалі-конкурсе зробяць 17 лядовых скульптур. Аўтары трымаюць у сакрэце, што яны адлюстроўюць.

sputnik.by

# РАСТАПІЦЕ ЛЕДЗЯНОЕ СЭРЦА

**Трэці фестываль-конкурс лядовых і снежных скульптур «Свет крышталяў» пройдзе ў Цэнтральным батанічным садзе НАН з 9 па 11 лютага.**

15 кавалкаў лёду, кожны па 50 — 80 кілаграмаў, а таксама снежна-лядовыя кубы — вось з чаго майстры на вачах у гледачоў ствараць шэдэўры. Нягледзячы на марознае надвор'е, прафесійныя скульптары і творчая моладзь ужо заўтра прымуцца за працу, а ў суботу скончаць выраб скульптур. Тады ж і пройдуць урачыстае адкрыццё фестывалю, гала-канцэрт і ўручэнне дыпломаў за 1-е, 2-е і 3-е месца ў конкурсе.

— Усяго сем каманд па два прафесійныя скульптары ў кожнай з іх, а таксама навучэнцы каледжаў будуць рабіць 17 скульптур з лёду і снежна-лядовых кубоў, — расказала Алена Сакурэнка, загадчыца сектара інфармацыйна-асветніцкай працы батанічнага саду.

Выставу ледзяных скульптур можна будзе назіраць ужо з нядзелі і да канца зімы. Усе скульптуры будуць аснашчаны падсветкай, так што вечарам тут будзе яшчэ больш прыгожа і цікава.

**Аліна СЯРГЕЕВА**

Аліна Сяргеева. Растапіце ледзяное сэрца